Ці можа Беларусь атрымаць кампенсацыю за Чарнобыль (стар. 2)
Бацюшкі хрысцяць кінжалы, а начальства «працуе падсвечнікамі» (стар. 3)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец "Газэта СВАБОДА, Ltd."
Наклад 93.000
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская,56
Тэл./факс 362441

16 лютага 1996 г. № 11 Кошт свабодны

Прэс-канферэнцыі

Іван, прызнайся!

Каментуючы прапанову аб стварэнні парламенцкай камісіі па праверцы дзейнасці кіраўніцтва справамі прэзідэнта дэпутат ВС Багданкевіч заявіў на прэс-канферэнцыі: "Па нашых звестках, адлічэнні ў бюджэт ад дзейнасці кіраўніцтва справамі складаюць 1/3. Куды ідуць астатнія сродкі, мы і павінны будзем высветліць".

МВФ з намі?

Каментуючы вынікі знаходжання ў Беларусі місіі МВФ, віцэ-прэм'ер Леанід Сініцын заявіў: "Беларусь не перарвала адносін з МВФ па праграме *stand-by*". Па словах сп.Сініцына, місія вызначыла некалькі момантаў, якія не задаволілі экспертаў. Сярод іх — тармажэнне тэмпаў прыватызацыі, празмернае рэгуляванне валютнага рынка і некаторыя іншыя.

Цана мужнасці — інфаркт

З журналістамі сустрэліся ўдзельнікі беларуска-амерыканскай канферэнцыі "Актуальныя праблемы фарміравання прававой дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь". Амерыканскі прафесар Гэры Шоў, які тры гады таму прымаў удзел у распрацоўцы Канстытуцыі Беларусі, выказаў меркаванне, што негатыўным адносінам прэзідэнта Лукашэнкі да Канстытуцыйнага суда не трэба здзіўляцца. На яго думку, цалкам натуральна, што судздзі КС павінны валодаць асабістай мужнасцю, каб заяўляць аб неканстытуцыйнасці ўказаў прэзідэнта. Адказваючы на пытанне, ці былі ў ЗША за два стагоддзі канстытуцыйнай законнасці прэзідэнты, якія не надта пачціва ставіліся да асноўнага закона, адвакат Дуглас Фрайфелд (прадстаўнік Амерыканскай асацыяцыі юрыстаў) адказаў, што найноўшая гісторыя такіх выпадкаў не ведае.

Калі вы выпісалі СВАБОДА толькі на першы квартал, не забудзьцеся працягнуць падпіску на наступныя тры месяцы

КОШТЫ РАНЕЙШЫЯ:
1 месяц – 9.000 руб.
3 месяцы – 27.000 руб.

Падпіска завяршаецца 10 сакавіка

БНФ патрабуе ад Лукашэнкі спагнаць з Расіі 30 мільярдаў долараў

У сувязі з набліжэннем дзесятай гадавіны катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Сойм Беларускага народнага фронта прыняў заяву.

У ёй адзначаецца, што пасля абвяшчэння суверэнітэту Расійскай Федэрацыі ды развалу СССР выплаты дзеля кампенсацыі матэрыяльных стратаў Беларусі, якія прыняў на сябе ўрад СССР, былі спыненыя маскоўскімі ўладамі. Між тым, Расія з'яўляецца правапераемніцай СССР, менавіта ёй адышла саюзная маёмасць за мяжой, залаты запас, флот ды г.д. Сума запазычанасці Расійскай Федэрацыі Рэспубліцы Беларусь за Чарнобыль складае, паводле заявы Сойму БНФ, 30 мільярдаў долараў.

"Разам з тым Расія рэгулярна патрабуе выплатаў за пастаўку энерганосьбітаў на Беларусь, а ўрад А.Лукашэнкі рэгулярна робіць гэтыя выплаты коштам далейшага зніжэння жыццёвага ўзроўню людзей, —адзначаецца ў заяве. — Мы патрабуем ад прэзідэнта Лукашэнкі тэрміновага ўзбудзіць справу аб выплатах Расійскай Федэрацыяй грашовае кампенсацыі Беларусі ў памерах і ў тэрміны, якія былі прадугледжаны адпаведнаю пастановаю Савета міністраў СССР.

Набліжаецца заканчэнне 10-гадовага тэрміну, вызначанага міжнародным правам для звароту ў міжнародныя арганізацыі са скаргамі, калі краіна, якая нанесла шкоду, не жадае выконваць сваіх абавязкаў. Адмову А.Лукашэнкі беларускі народ будзе разглядаць як здраду нацыянальным інтарэсам Беларусі".

Павел

(Працяг тэмы на стар. 2)

СКАНДАЛ

«Дзіця прэзідэнта» губляе імунітэт

Як стала вядома карэспандэнту СВАБОДЫ, у самой службе кантролю прэзідэнта знайшлі злодзеяў, якія прысвоілі дзяржаўнай маёмасці і розных каштоўнасцей на сотні мільёнаў рублёў.

Новы начальнік службы Мікалай Дамашкевіч, які замяніў на гэтай пасадзе Васіля Далгалёва, відаць не захацеў узяць на сябе чужыя грахі. Былы першы сакратар Сенненскага райкама КПБ праявіў тут сапраўдную камуністычную прынцыповасць. Звязацца з Дамашкевічам не ўдалося, а ягоныя намеснікі, да якіх звярнуўся карэспандэнт СВАБОДЫ за каментарыем па гэтай справе, зрабілі выгляд, быццам нічога не ведаюць.

Тым часам, некаторыя "засвечаныя" кантралёры ўжо збеглі са службы "па ўласным жаданні". Лёс астатніх павінен вырашыць прэзідэнт Лукашэнка, які, відаць, ужо азнаёмлены з усімі сімптомамі хваробы свайго дзіцяці. Тым больш, што скандальныя падрабязнасці ў "своей избе" ведае нават прыбіральшчыца.

З іншага боку, прэзідэнту Лукашэнку надта нявыгадна наводзіць парадак у сваім падраздзяленні. Тым больш перад зацверджаннем у Вярхоўным Савеце кандыдатуры свайго паплечніка віцэ-прэм'ера Васіля Далгалёва. Аднак, калі экс-кантралёр стварыў умовы спрыяльныя для крадзяжу дзяржаўнай маёмасці ў прэзідэнцкай службе, то што можна гаварыць пра ўсю краіну?

Хутчэй за ўсё, замешаныя ў скандале (а сярод іх дэпутаты цяперашняга парламенту) будуць намагацца пагасіць полымя. Але ў такім выпадку канчаткова страчаны імунітэт пагражае летальным зыходам.

Яўген КАВАЛЁЎ

На беларускую мяжу прыбываюць расійскія памежнікі

По інфармацыі з дасведчаных крыніцаў, у Беларусі хутчэй за ўсё пачне працаваць апертыўная група расійскіх памежнікаў з 70 чалавек. Узначальваць яе будзе генерал-маёр Валерый Марцюшын, які ўжо знаходзіцца ў Мінску.

Расійскія памежнікі будуць працаваць у месцах інтэнсіўнага руху людзей і грузаў на еўрапейскім і прыбалтыйскім накірунках — у Брэсце, Гродне, Лідзе, Смаргоні. Мэтаю знаходжання памежнікаў з суседняй дзяржавы будзе з'яўляцца кантроль за праходжаннем расійскіх грузаў і супрацоўніцтва з беларускімі памежнікамі і мытнікамі. Аператыўная група павінна будзе ажыццяўляць кантроль за тэхнічным абсталяваннем мяжы з Літвой і Латвіяй, аснашчэнне якой часткова ўзяў на сябе расійскі бок. Гэтую ініцыятыву Масква тлумачыць тым, што менавіта прыбалтыйскі рэгіён з'яўляецца асноўнай крыніцай кантрабандных грузаў (транзітам праз Беларусь) у Расійскую Федэрацыю.

СІМ

Адзіная «наркатычная зона»

У Гомелі адбылося пашыранае паседжанне рэгіянальнай мытні, на якім была ўзнята праблема нелегальнага ўвозу наркотыкаў з Расіі.

З дакладам выступіў намеснік начальніка мытні М.Цішын. Ён адзначыў, што стварэнне адзінай мытнай зоны з Расійскай Федэрацыяй прывяло да таго, што цяпер практычна немагчыма выявіць асобаў, якія вязуць у Беларусь наркотыкі з Расіі. Кіраўнік мытні лічыць, што ўвоз наркотыкаў з Расіі стаў, па-сутнасці, некантралюемым. На Гомельшчыне ад гэтага пакутуюць перш за ўсё гарады, дзе жыве шмат моладзі — Жлобін, Рэчыца, Светлагорск.

Гэта ўжо не першае афіцыйнае выступленне з боку кампетэнтных спецыялістаў, якія лічаць, што адзіная мытная зона з Расіяй становіцца, перш за ўсё, адзінай наркатычнай і адзінай крымінальнай зонай.

Тэльман МАСЛЮКОЎ

Польскія журналісты выказваюць салідарнасць

Канферэнцыя польскіх сродкаў масавай інфармацыі, на якой былі прадстаўленыя ўсе найбольш уплывовыя СМІ Польшчы прыняла рэзалюцыю, дзе выказала сваю салідарнасць да ўсіх супрацоўнікаў беларускіх мас-медыя ў іх намаганнях супраць палітычнага ўціску.

Прадстаўнікі польскіх СМІ выказалі непакой адносна распараджэння прэзідэнта Беларусі наконт таго, што ўсе выданні, а таксама недзяржаўныя радыё- і тэлеперадачы павінны прайсці перарэгістрацыю. Калегі з Польшчы выказваюць спадзяванне, што гэтае распараджэнне не стане прычынаю забароны незалежных СМІ. "Падзяляем таксама заклапочанасць нашых беларускіх калегаў з прычыны падпарадкавання ўсіх друкарняў і сістэмы распаўсюджання прэсы прэзідэнцкім структурам," — адзначаецца ў рэзалюцыі. У ёй падкрэсліваецца, што свабода слова і незалежнасць СМІ з'яўляецца вялікім здабыткам грамадскасці Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Кожная спроба пазбавіць гэтых здабыткаў — кім і ад каго яна б не сыходзіла — мусіць выклікаць непакой і міжнародную салідарнасць работнікаў СМІ.

А.Б.

Новы кадр са Шклова

Начальнік галоўнага ўпраўлення падатковых расследаванняў (ГУПР) Валерый Чарамісаў зняты з пасады.

Цалкам верагодна, што Чарамісава адправілі ў адстаўку з-за выяўленых у ягоным ведамстве фактаў карупцыі. Напрыклад, напачатку лютага былі арыштаваны начальнік сталічнага міжраённага аддзела падатковых расследаванняў, якога падазраваюць у хабарніцтве. Новым шэфам ГУПР на гэтым тыдні прызначаны начальнік Шклоўскага райаддзела міліцыі Яўген Дзярніцкі.

СІМ

28 лютага прафсаюзы збіраюцца пратэставаць

Асацыяцыя незалежных прафсаюзаў прамысловасці (АНПП) падала заяўку ў Мінскі гарвыканкам на правядзенне 28 лютага на плошчы Незалежнасці сустрэчы дэпутатаў Вярхоўнага Савета з прадстаўнікамі працоўных калектываў прамысловых прадпрыемстваў.

Пра гэта паведаміў дэпутат ВС, кіраўнік прафсаюза працаўнікоў аўтамабільнага і сельскагаспадарчага машынабудавання Аляксандр Бухвостаў. Згодна з дзеючым заканадаўствам, на працягу дзесяці дзён гарадскія ўлады павінны даць афіцыйны адказ на заяву АНПП.

Чакаецца, што ў мерапрыемстве возьмуць удзел некалькі дзесяткаў тысяч працоўных, якія пратэстуюць з прычыны невыканання ўрадам сваіх абавязацельстваў (запазычанасць па заработнай плаце, адсутнасць умоваў для нармальнай працы прамысловасці і шмат што іншае). Кіраўніцтва Асацыяцыі плануе выступіць са зваротам да ўсіх прафсаюзаў з заклікам падтрымаць акцыю пратэсту.

Ірына ЛЕЎШЫНА
БелаПАН

Сяргей Антончык звольнены з працы

Калі рэпрэсіі будуць працягвацца, экс-дэпутат збіраецца прасіць палітычны прытулак за мяжой

Пасля вяртання з адпачынку лідэр страйкавага руху і былы дэпутат Апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Сяргей Антончык звольнены па "скарачэнні штату" з завода "Белвар".

Гэта ёсць парушэнне заканадаўства, якое гарантуе былым парламентарыям працу на працягу двух гадоў пасля сканчэння паўнамоцтваў. Антончык расцэньвае гэта як палітычны пераслед, які распачаўся пасля вядомага даклада аб карупцыі ў камандзе прэзідэнта і доўжыцца больш за год. Летась у жніўні, падчас страйку на Менскім метрапалітэне Антончык быў інтэрніраваны на тэрыторыі падраздзялення Унутраных войскаў. Хаця Канстытуцыя Беларусі прадугледжвае, што дэпутат не нясе юрыдычнае адказнасці за дзейнасць у Вярхоўным Савеце, спадару Антончыку было прысуджана выплаціць 200 мільёнаў рублёў маральнай кампенсацыі кіраўніку справамі прэзідэнта Івану Ціцянкову. Некалькі тыдняў таму да Антончыка ўжо звярталіся судовыя выканаўцы, каб апісаць ягоную хатнюю маёмасць.

— Ціск з боку ўладаў адчуваюць і іншыя былыя дэпутаты апазіцыі, — кажа Сяргей Антончык. — Цяпер я чакаю адказу ад Генеральнага пракурора, рыхтую зварот да старшыні Вярхоўнага Суда. Калі ўлады не пакінуць мяне ў спакоі, я буду звяртацца да міжнароднай супольнасці з просьбай палітычнага прытулку. Бо гэта закранае ўжо не толькі мяне аднаго, а маю сям'ю, маіх дзяцей.

Павел

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Небяспечныя прафсаюзы

Дэпутаты парламента лічаць, што адміністрацыя дэпо “Маскоўскае” парушае правы чалавека

У аўторак 13 лютага работнікі электрадэпо “Маскоўскае” мінскага метрапалітэна у чарговы раз спрабавалі правесці сход арганізацыі Свабоднага прафсаюза, якая цяпер перарэгістравана ў арганізацыі Дэмакратычнага прафсаюза транспартнікаў. Аднак адміністрацыя прадпрыемства зноў перасякла ўсе спробы.

Ужо амаль шэсць месяцаў членаў гэтага прафсаюза не прапускаюць на тэрыторыю дэпо і не дазваляюць праводзіць сходы. Пры гэтым кіраўніцтва метро спасылаецца на славуты прэзідэнцкі указ № 336, якім была забаронена дзейнасць прафсаюзаў. Той факт, што Канстытуцыйны суд прызнаў гэты ўказ супярэчным Канстытуцыі, адміністрацыя метраналітэна ігнаруе.

Гэтым разам сам начальнік дэпо “Маскоўскае” М.Клімаў сваімі грудзямі закрыў ўваход на тэрыторыю прадпрыемства і не прапускаў рабочых. Нават дэпутатаў парламента, запрошаных на сход, доўгі час не пускалі ў дэпо. Сп.Клімаў свае дзеянні тлумачыў тым, што дэпо з'яўляецца прадпрыемствам “повышенной опасности и посторонним лицам вход воспрещен”. Нарэшце пасля доўгіх перамоваў, шасці прысутным дэпутатам (сярод якіх былі, у прыватнасці, Аляксандр Дабравольскі і камуніст Валерый Шчукін) дазволілі стаць пасярэднікамі ў вырашэнні канфлікту. Пасля тэлефоннай размовы з дырэктарам метрапалітэна, вывучэння калектыўнай дамовы паміж адміністрацыяй дэпо і працоўным калектывам дэпутаты прыйшлі да высновы, што кіраўніцтва прадпрыемства парушае Канстытуцыю і закон “Аб прафсаюзах”. Дэпутат Вярхоўнага Савета, намеснік старшыні парламенцкай камісіі па правах чалавека Уладзімір Нісцюк заявіў, што “ў адміністрацыі дэпо няма ніякіх падставаў сёння забараняць работнікам метро праводзіць прафсаюзны сход”. Па яго словах, гэта — “грубае парушэнне правоў чалавека”. “Таму мы маем намер, — сказаў сп.Нісцюк, — накіраваць дэпутацкі запыт Генеральнаму пракурору, каб ён правёў праверку па факту парушэння закона”.

Віктар ВАЛАДАШЧУК

Кожнай школе – воінскае падраздзяленне!

Аддзелы народнай адукацыі Мінска даслалі ў школы “планы мерапрыемстваў, прысвечаных 78-й гадавіне ўзброеных сілаў краін СНД”.

Цэнтральны РАНА правёў нараду “Пра ролю і адказнасць настаўніка ў падрыхтоўцы і правядзенні свята 78-й гадавіны ўзброеных сілаў Рэспублікі Беларусь”. Да 23 лютага вучні старэйшых класаў вымушаныя напісаць сачыненне на тэму “Непобедимые, несокрушимые Вооруженные Силы нашего Отечества”. Сярод 26-ці пунктаў плана ёсць заданне нават для настаўнікаў фізкультуры, якім загадана правесці спаборніцтвы па лыжах і спартовых гульнях на прыз “Мое Отечество”. Больш таго, з дапамогай міністэрства абароны за школамі замацуюць воінскія падраздзяленні “для правядзення шэфскай работы па ваенна-патрыятычным выхаванні вучняў”.

Аднак не зусім ясна, якія “сілы” і якое “отечество” маюць на ўвазе чыноўнікі ад адукацыі. Вяртанне да мілітарызацыі навучання — адзіная рэформа, на якую яны здольныя?

Мікола ВАЙТОВІЧ

Каму хацелася запалохаць Грыба?

Увечары 8 лютага, пасля прыёму ў амбасадзе Вялікабрытаніі з нагоды прыбыцця новага пасла, Мечыслаў Грыб вяртаўся дадому пешкі праз парк імя Горкага. Раптам заўважыў, што да яго бягуць трое мужчын. Параўняўшыся з Грыбам, яны запатрабавалі цыгарэту. Далей быў дыялог:

— Вы падумалі? — запыталіся незнаёмцы ў Грыба.

— Я заўсёды думаю, — адказаў былы спікер (дарэчы, ён не курыць).

Незнаёмцы зніклі.

Мечыслаў Грыб не сцвярджае, што гэта была спроба адмысловага замаху — зусім верагодна, што і выпадковасць...

— Міліцыя пакінула гэты цэнтральны парк сталіцы без нагляду, — заўважае спадар Грыб, — і пасля шасці гадзінаў вечара людзі наогул баяцца сюды заходзіць. Затое шлындаецца розная шантрапа...

Але тыя незнаёмцы былі не 16-гадовымі падлеткамі, не былі падобнымі яны і на “барыгаў” — у добрых скураных куртках, моцнага целаскладу і выглядалі цвярозымі.

Не выключана, што ў дачыненні да Грыба планаваўся даволі распрацоўданы сцэнар запалохвання. Гэта калі чалавека падпільноўваюць у пад'ездзе ці ў бязлюдным месцы і моцна б'юць, але не да смерці і часам нават не пакідаюць цяжкіх траўмаў. Калі так, то незнаёмцаў у апошні момант саміх нешта напалохала — магчыма, верагоднасць таго, што экс-спікер мог мець пры сабе зброю і пачаў бы абараняцца.

Натуральна, незнаёмцы засталіся інкогніта. Дарэчы, да гэтага часу застаецца невядомым і кіроўца іншамаркі, якая ўвосень на праспекце Скарыны на вялікай хуткасці неслася на аўтамабіль старшыні Канстытуцыйнага суда Валерыя Ціхіні і знікла з месца здарэння...

Галіна ПРЫГАРА

Кебіч – сацыял-дэмакрат?

Сакратар міжнароднай камісіі парламенту Вольга Абрамава ўступіла ў сацыял-дэмакратычную фракцыю, якая цяпер мае назву “Саюз працы”. Такім чынам, гэтая фракцыя налічвае ўжо 18 дэпутатаў.

Адзін з лідэраў Сацыял-дэмакратычнага саюзу Мікола Статкевіч упэўнены, што занадта захапляцца перацягваннем дэпутатаў з іншых фракцыяў не варта: “Па-першае, можна згубіць палітычны твар, а па-другое, сапраўдныя сацыял-дэмакраты могуць застацца ў фракцыі ў меншасці”. Магчыма, з гэтай прычыны фракцыя адмовілася ад паслугаў Вячаслава Кебіча, які, як сцвярджае Статкевіч, хацеў уступіць у “Саюз працы”.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

У міністэрстве сельскай гаспадаркі выспявае скандал

Пракуратура Рэспублікі правярае факты выкарыстання мэтавых крэдытаў закрытым акцыянерным таварыствам “Руст-Інвест”.

Рэч у тым, што гэтая фірма ў снежні мінулага года заключыла дамовы з калгасамі і саўгасамі краіны, а таксама з Камітэтам па хлебапрадуктах на пастаўку збожжа. Аднак, атрымаўшы ў агульнай суме 64,7 мільярда рублёў, “Руст-Інвест” так і не выканала сваіх абавязацельстваў. Цалкам верагодна, што гэты скандал можа закончыцца адстаўкай некаторых кіраўнікоў міністэрства сельскай гаспадаркі, якія настойліва рэкамендавалі калгасам і саўгасам заключаць дамовы менавіта з “Руст-Інвестам”.

СІМ

У Барысаве зафіксавана кампутарнае злачынства

У Барысаўскай філіі аднаго з камерцыйных банкаў супрацоўнікі службы па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю раскрылі факт кампутарнага злачынства.

Адзін з работнікаў банка, які меў доступ да кампутарнай сеткі, “залазіў” у праграму і пералічваў на рахункі сваіх знаёмых грошы. Дзіўна, што банк, дзе працаваў “хакер” (так называюць кампутарных махляроў), пакуль што не звярнуўся ў праваахоўныя органы з патрабаваннем пакараць злачынцу. Банк, відаць, гатовы несці страты ад “хакера”, абы толькі гэты факт не стаў шырокавядомым, інакш ён можа згубіць кліентаў, а, значыць, і велізарныя грошы.

СІМ

АКТУАЛЬНА

Ці можа Беларусь атрымаць кампенсацыю за Чарнобыль

Шанцаў няшмат. Асабліва з нашым кіраўніцтвам

Шматтысячны “Чарнобыльскія шляхі” 1989-92 гг. засталіся ў гісторыі. Кажуць, што наступствы катастрофы з кожным годам хваляюць людзей усё менш і менш. Ці сапраўды так? 26 красавіка 1996 г. пакажа.

26 красавіка споўніцца 10 гадоў Чарнобыльскай аварыі — самай страшнай экалагічнай катастрофы ў гісторыі чалавецтва. Гэты трагічны юбілей, аднак, не толькі пэўная маральна-палітычная мяжа, але і канкрэтнае юрыдычнае паняцце — “тэрмін даўнасці”. Менавіта на працягу 10 гадоў, паводле міжнароднага права, адны краіны могуць прад'яўляць юрыдычныя альбо маёмасныя прэтэнзіі да іншых. Пасля 26 красавіка Беларусь ужо ніколі не будзе мець падставаў патрабаваць ад камгосці кампенсацыі за нанесеныя Чарнобылем страты.

З надыходам гадавіны Чарнобыля самыя розныя палітыкі навыперадкі кінуліся ўздымаць праблему кампенсацый у сваіх папулісцкіх мэтах. Ініцыятыву ў свае рукі імкнуцца ўзяць якраз тыя людзі, якія раней не асмельваліся нават слова сказаць, не ўзгадніўшы яго з Масквой. Цяпер, прэтэндуючы на лаўры выратавальнікаў народа, яны гатовыя патрабаваць ад “братняй Расіі” самай вялізнай кампенсацыі.

Аднымі з першых “чарнобыльскую актыўнасць” выявілі некаторыя дэпутаты Вярхоўнага Савета, якія днямі прапанавалі ўнесці праблему міжнароднай кампенсацыі за Чарнобыль у парадак дня сесіі. Займальна, што найбольш рашуча за гэта выступаў Аляксей Камай, на негатыўную ролю каторага ў першыя месяцы аварыі, здаецца, пачалі ўжо забываць. Калега Камая па фракцыі камуністаў дэпутат Віктар Хоміч (старшыня парламенцкай камісіі па чарнобыльскіх праблемах) трохі здзіўлены такой нечаканай актыўнасцю. “Што перашкаджала Камаю ставіць гэтае пытанне на працягу ўсіх 10 гадоў?” — гаворыць Хоміч. Па словах старшыні камісіі, пакуль жаданне дэпутатаў уключыць гэтую праблему ў парадак дня не ўзмоцнена ніякімі падрыхтаванымі праектамі. “10 гадоў маўчалі, а цяпер давайце бягом што-небудзь прымем? Ніводнае міністэрства ці ведамства, ніводная дэпутацкая камісія пакуль не прапанавала нам ніякіх дакументаў на гэты конт”, — падкрэслівае Хоміч.

Лепш за іншых гэту сітуацыю мог бы патлумачыць былы міністр замежных справаў Пётр Краўчанка. На маё пытанне, якія шанцы мае Беларусь атрымаць кампенсацыю ад іншых краінаў, Краўчанка адказаў: “Амаль тупіковыя. Ня глядзячы на эмоцыі, якія разгараюцца ў парламенце, надзейных юрыдычных падставаў у нас няшмат”. Краўчанка лічыць, што да гэтай праблемы трэба адносіцца “вельмі ўзважліва”, бо, на думку экс-міністра, “можна сапсаваць адносіны з Расіяй і нічога не атрымаць”. “Калі б у нас было глыбокае перакананне, што мы нешта атрымаем яшчэ 2-3 гады таму, мы маглі б больш востра паставіць гэтае пытанне. Я думаю, шанцы невялікія”, — гаворыць старшыня парламенцкай камісіі па міжнародных справах.

У міністэрстве замежных справаў наогул лічаць гэтае пытанне бесперспектыўным. Адзін з чыноўнікаў МЗС, які прасіў не называць ягонае прозвішча (усе кантакты з прэсай у гэтым міністэрстве цяпер ажыццяўляюцца толькі “афіцыйным” чынам і з дазволу міністра), зусім адназначна заявіў СВАБОДЗЕ, што Беларусь не мае ніякіх шанцаў на матэрыяльную кампенсацыю ад іншых краінаў. Адносіны паміж дзяржавамі ў гэтай сферы вызначаюцца Канвенцыяй 1963 года аб адказнасці за ядзерны ўрон. Але гэты дакумент не ратыфікавалі ні СССР, ні яго правапераемніца Расія, ні незалежныя Беларусь і Украіна. “З каго мы можам патрабаваць кампенсацыю? З пацярпелых Расіі ды Украіны?” — здзіўляецца прадстаўнік МЗС. Дарэчы, паводле вышэйназванай Канвенцыі, апературам, інакш кажучы — адказным за дзейнасць чарнобыльскай станцыі з'яўляецца Украіна. Так што патрабаваць нейкія грошы ад Расіі, паводле міжнароднага права, няма ніякіх юрыдычных падставаў.

Зусім іншы паварот тэмы — палітычны. Пасля абвяшчэння суверэнітэту Расіі і распаду СССР Масква ў аднабаковым парадку прыпыніла выплаты па саюзным “чарнобыльскім” законе. Узяўшы на сябе ўсю савецкую спадчыну — замежную маёмасць, залаты запас і г.д. — Расія, аднак, не жадае прызнаваць даўгі СССР па Чарнобылю. Расія адмаўляецца плаціць нейкія грошы і, па ўсім відаць, можа знайсці дастаткова юрыдычных падставаў для гэтага.

У такой сітуацыі карысней было б патрабаваць ад Масквы не нейкіх матэрыяльных выплат, а зніжэння коштаў на энерганосьбіты, скасаванне даўгоў і іншых палітычных рашэнняў. Дарэчы, менавіта ў такім кантэксце ставіць гэтае пытанне БНФ.

Ідэю “псіхалагічнага ціску” падтрымлівае і Пётр Краўчанка: “Мы бачым паводзіны Украіны, якая не просіць, а патрабуе. І ёсць традыцыйная манера паводзінаў беларускага кіраўніцтва, якое часцей за іншых звяртаецца з просьбамі. Відома ж, асабліва ў час перамоваў самнасам узнікае няёмкасць, звязаная з тым, каб больш рашуча ставіць гэтае пытанне. Я думаю, нам трэба мяняць псіхалогію адносін з Расіяй, меней, як кажуць, глядзець ёй у рот, а больш канкрэтна і настойліва абараняць нашы нацыянальныя інтарэсы”.

Віталь ЦЫГАНКОЎ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Калі чыноўнікаў скарачаюць, іх становіцца болей

Славутая рэарганізацыя мясцовай "вертыкалі" пасля нядаўняга ўказу прэзідэнта прывяла не да зьмяншэньня колькасьці чыноўнікаў, а да іх павелічэньня.

Напрыклад, у Магілёўскім гарвыканкаме ўзору 1994 года працавала прыкладна 110 чыноўнікаў, то цяпер набярэцца 197. Што дзіўна — у новай структуры гарвыканкама няма аддзела экалогіі. У абласным цэнтры, адным з самых экалагічна небясьпечных градоў Беларусі, які да таго ж знаходзіцца пад уплывам наступстваў Чарнобыля, не знайшлося месца аддзелу, якому ставілася ў абавязак фарміраваць экалагічныя праграмы ў горадзе і наладжваць кантроль за іх выкананнем.

Іван ЗАСАДА

260 імгненняў зімы

139 вайсковых бінокляў, 11 прыцэлаў ды іншае армейскае абсталяваньне зьнікла са склада вайсковай часткі ў Гомелі, якім загадвала грамадзянка Т.Алейнікава. Супраць яе ўзбуджана крымінальная справа.

На Гомельскім складзе захоўвалася вайсковая оптыка з частак, што выводзіліся з тэрыторыі падчас падзелу войскаў на беларускае і расійскае. Такім чынам, "аптычная справа" гэта, так бы мовіць, малодшая сястра "плацінавай справы", якую цяпер раскручвае беларуская вайсковая пракуратура. Сюжэт паўсюль адзін: вайсковая маёмасьць былога СССР складзіравалася без належнага парадку, а потым раскрадалася пад носам у генералаў, якія ў той час біліся за пасады ды партфелі. Спадарыня Алейнікава таксама, як лічыць следства, свайго не ўпусціла: кожны з бінокляў 30-разовага павялічэньня каштаваў на чорным рынку больш за 100 даляраў.

Вось толькі не могуць следчыя ўзяць у галаву, каму спатрэбілася столькі секундамераў — іх недалічыліся ажно 260 штук. Такое ўражаньне, быццам гаспадыня сховішча гандлявала часам, забыўшыся на просты закон: як ні расцягвай салодкія імгненні, але фініш усё роўна будзе.

А.Г.

Хочаш сьвяткаваць юбілей – прасі дазволу

Брэсцкі аблвыканкам вырашыў узяць сьвяткаваньне ўсіх юбілеяў пад свой пільны кантроль.

Як тлумачыцца ў прынятай абласнымі ўладамі пастанове, "нясцілася правядзенне юбілеяў прадпрыемстваў, арганізацыяў, установаў, таварыстваў, навучальных установаў, некаторых асоб без уліку заслуг юбіляраў канкрэтнай абстаноўкі і сітуацыі". Абласная "вертыкаль" раптам занепакоілася, што юбілейныя ўрачыстасці, якія з помпай прызывчаіліся ладзіць чыноўнікі, выбіваюцца ў кампанію, што выклікае абуральную рэакцыю ў народа. Цяпер, паводле рашэньня аблвыканкама, падставаю для сьвяткаваньня можа служыць толькі 50-годдзе ўстановы ці канкрэтнай асобы. Потым ужо юбілейнымі могуць лічыцца ўсе наступныя дзесяцігоддзі, але іх неабходна будзе ўзгадняць з выканкамам.

Ігар БАРАНОЎСКІ

Вернікі скардзяцца ўладам

Напружаная рэлігійная сітуацыя склалася ў Ляхавічах Брэсцкай вобласці.

Група праваслаўных вернікаў зьвярнулася ў райвыканкам з просьбай вырашыць канфлікт, які ўзнік у прыходзе. Вернікі хочуць, каб улады дапамаглі ім замяніць настаяцеля храма айца Міхаіла, які мае ўжо 79 год, на больш маладога сьвятара. Прыхаджане сьцьвярджаюць, што айцец Міхаіл ужо не ў стане праводзіць адпаведным чынам службу, выязджаць на пахаваньні. Але другая частка прыхажан стаіць на баку айца Міхаіла. Гэтыя прыхажане лічаць, што сьвятар павінен служыць "столькі, колькі дасць Бог".

Гэты канфлікт ужо цягнецца даўно. Яшчэ два гады таму ў Пінскім епархіяльным упраўленні палічылі неабходным адправіць айца Міхаіла Калошу на пенсію. Царкоўнае начальства лічыць, што айцец Міхаіл, адчуўшы падтрымку групы прыхажанаў, пераступіў царкоўны закон і стаў на шлях непаслушэнства. Як інфармуе райвыканкам і вернікаў епіскап Пінскі і Лунінецкі, "за ігнараванне патрабаванняў статута пратаерэй Калоша М.М. быў забаронены ў сьвяшчэнаслужэньні".

Нядаўняя размова ў райвыканкаме нібыта дала нейкі вынік. Айцец Міхаіл паабяцаў пакінуць прыход пасля прыезду новага сьвятара і пайсці на пенсію.

Узнікаюць праблемы і ў каталікоў. Вернікі з вёскі Мядзевічы Ляхавіцкага раёна жадаюць мясцовым уладам на "самаўпраўства" настаяцеля мясцовага касцёла. Парафіяне сабралі грошы на рэстаўрацыю касцёла і цяпер падазраюць, што сьвятар выкарыстаў іх на нейкія іншыя мэты.

Ігар БАРАНОЎСКІ

ПОГЛЯД

Бацюшкі хрысцяць кінжалы, а начальства «працуе падсвечнікамі»

Беларусь — краіна праваслаўная і па-ранейшаму атэістычная? Гэтае пытаньне выкарыстоўваецца сёньня палітычнымі коламі для ідэалагічных спекуляцый. Праўда ім пры гэтым непатрэбная.

Працэнтаманія

Часам даводзіцца сустракаць крыху дзіўныя на першы погляд звесткі. Напрыклад, адна польская газета піша, што на Беларусі 80% вернікаў — каталікі. У нас жа пішуць зусім адваротнае: што 80% — праваслаўныя. Каму ж верыць? А нікому, — як мне здаецца.

Ад гэтай, відавочна, выдуманай лічбы, аднак, нельга проста адмахнуцца, бо яна адыгрывае важную ролю ў ідэалогіі цяперашняга мінскага кіраўніцтва. Адкуль магла ўзяцца падобная лічба? Толькі з вынікаў дэмаграфічнага перапісу. Але я асабіста не прыпомню, каб у мяне цікавіліся, якой я веры. А вы? Таксама? Канечне, бо ў савецкіх перапісах веравызнаньне перавважна атэістычнага насельніцтва не ўлічвалася ды і не магло ўлічвацца. Паколькі атэізацыя, як і астатнія (сярэдняя адукацыя або пашпартызацыя) паводле планаў партыі ўвасабляліся масава, усеагульна.

Дык што ж гэта за дзіўныя працэнты? Калі даць веры, што чатыры пятых насельніцтва — праваслаўныя, дык на астатнія вызнанні прыпадае толькі пятая частка. Значыцца, мы выходзім з таго, што ўсе грамадзяне нашай краіны — веруючыя. Але ж гэта зусім недарэчнае меркаваньне! Штучная лічба, магчыма, грунтуецца на тым, што амаль 80% жыхароў — беларусы, якіх апошнім часам машынальна называюць праваслаўнымі. У такім разе да каго залічваць нашых рускіх, украінцаў? Лагічнага тлумачэньня няма.

Ювелірную краму папырскалі сьвятой вадой

Апошнім часам стала модным на адкрыццё якой-небудзь справы запрашаць сьвятара. Мне таксама аднойчы давялося прысутнічаць пры адкрыцці ювелірнай крамы і назіраць, як асьвячаюць вітрыны, поўныя залатых вырабаў. Сьвятароў на прэзентацыі было некалькі. Выконваў працу адзін з іх, астатнія дапамагалі. Публіка вельмі паважна паглядала на дастаткова камічную сцэну: бацюшка хрысціў дарагія ювелірныя вырабы, адзначаючы сцены ў памяшканні дробнымі крыжыкамі чырвоным фламастарам. Адзін мой калега-журналіст толькі паскардзіўся мне, што ягонага заробку хіба хапіла б на палову інкруставанага кінжала, які бацюшка блаславіў на добры продаж. Старанні апошняга былі недарэмнымі, паколькі царква атрымала на свае патрэбы грошы ад гаспадароў багатай крамы.

Вядомы расійскі сатырык Задорнаў іранізуе: цяпер аніводная гусоўка без бацюшкі не абыходзіцца. А начальства, маўляў, наадварот, пачало "працаваць у якасьці падсвечнікаў" — як ні набажэнства, стаяць у храмах з запаленымі свечкамі ў руках грозныя начальнікі. Хай стаяць, калі падабаецца. Гэта ўсё ж лепш, чым сядзець у прэзідыуме на партсходах. Цікава толькі, што ж гэтае начальства адчувае пры гэтым? Напрыклад, з адказаў Лукашэнкі на пытанне наконт ягонага стаўлення да рэлігіі можна даўмецца, што ён з'яўляецца "атэістам праваслаўнай арыентацыі". У М.Чыгіра ў інтэрв'ю тэлекампаніі "Мір" таксама аднойчы пацікавіліся пра ягоную веру ў Бога. Прэм'ер з дзіцячай шчырасцю паведаміў, што ўвогуле не верыць, але часам яму пачынае здавацца, што "нешта там такое ўсё ж павінна быць". Што ці хто? Можа "ўсявышні", якога любяць узгадваць у тэленавінах, не зважаючы, што слова гэтае рэжа вуха, бо датычыць больш веры магаметанкай. А мы ж, здаецца, "праваслаўныя атэісты".

Бог з ім...

У адной рэдакцыі рыхтавалі да друку пару маіх апавяданняў. Я не мог без іроніі назіраць, як кожнага разу ў слове "бог" першую літару перапраўлялі на вялікую. Нават у бязбожнай фразе "бог з ім". Рэч у тым, што раней усё рабілася б наадварот: мне нідзе б не дазволілі напісаць слова "бог" з прапіснай літары. На першы погляд, выпадак прыватны, але ўсё гэта праявы, як мне здаецца, таго ж самага "праваслаўнага атэізму". Сапраўдны палітык наўрад ці сказаў на тэлевізары: "Хрыстом Богам вас прашу і заклінаю", — як часам гаворыць наш "бацька". Тым больш зьвяртаючыся, наколькі памятаю, да журналістаў.

Са сваім статутам у чужы кляштар

Сацыялістычная сістэма ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, апроч іншых прычын, не мела шансаў яшчэ і таму, што ў краінах еўрапейскай каталіцкай традыцыі была зроблена спроба навязаць зусім іншы тып палітычнага жыцця, культуры і г.д. Таму, напрыклад, там няма болей помнікаў Леніну.

Раней расіяне разам з помнікамі сваіх імператараў замацоўвалі сваё панаванне пры дапамозе царквы. Так, у цэнтры Варшавы напачатку гэтага стагоддзя паставілі пампезны сабор Аляксандра Неўскага. Гэта быў чыста палітычны крок. Не дзіўна, што палякі, адрадзіўшы сваю дзяржаўнасць, разабралі па цагліне сабор, які супярэчыў навакольнай архітэктуры. Але, адрозна ад паводзінаў у падобных выпадках саміх расіянаў, палякі не знішчылі алтар і мазаікі, зробленыя паводле малюнкаў Васнецова ды іншых вядомых мастакоў. Іх перавезлі ў новы сабор, пабудаваны ў Баранавічах, дзе яны і знаходзяцца дагэтуль.

Акупаваўшы Гродна, расіяне напачатку XIX ст. прымацавалі да гатычнага касцёла Вітаўта некалькі "цыбулін", зрабіўшы з яго праваслаўны сабор. Потым палякі аднавілі справядлівасць: касцёл зноў стаў касцёлам. Напачатку 60-х гадоў савецкія ўлады яго ўвогуле знішчылі. У іншым месцы горада на плошчы Тызенгаўза была царскімі ўладамі пастаўлена царква ў псеўдарускім стылі. Палякі яе разабралі, замяніўшы помнікам змагарам за незалежнасць, а Саветы замест яго зрабілі ленінскую статую.

Колішні мясцовы епіскап Валянцін некалькі гадоў таму марыў на цэнтральным пляцы горада — Савецкім — насупраць самага вялікага на Беларусі касцёла пабудаваць яшчэ больш па памерах праваслаўны сабор. На месцы разбуранай фары Вітаўта. Перапілюнуць касцёл яму не ўдалося. Сам епіскап цяпер увогуле кіруе царкоўнымі справамі ў раёне баявых дзеянняў на Паўночным Каўказе. А ў архітэктурнай службе толькі з усмешкай успамінаюць пра ягоную гігантаманію.

"Лішняе" сьвята

У Гродне на Каляды ў польскім консульстве была сьвяточная вечарына. Спадар консул зазначыў, што Беларусь, бадай, унікальная краіна. Тут аднолькава адзначаюцца і праваслаўныя, і каталіцкія сьвяты. Якраз гэтай унікальнасці нас і хочуць пазбавіць. М.Чыгір, выступаючы ў парламенце, намякае, што сьвятаў замнога, няма калі працаваць. Маўляў, раней нават суботы былі на прадпрыемствах працоўныя. Дзіўная логіка. Цяпер нават працоўныя дні сталі на заводах выходнымі, бо няма працы, а спадару Чыгіру перашкаджае лішняе сьвята. Прычым, ён пакуль не наважваецца назваць яго ўголас, але ўсе разумеюць, што мова можа ісці толькі аб каталіцкіх сьвятах.

Між тым, праваслаўныя і каталіцкія сьвяты маюць абсалютна аднолькавае права на дзяржаўны статус. Бо калі ўзяць рэальную колькасьць вернікаў абедзьвюх канфесіяў (гэта значыць тых, хто рэгулярна наведвае храм) іх можа быць прыблізна аднолькава. Лічыць амаль усіх праваслаўнымі толькі на той падставе, што так было сто гадоў таму, гэта ўсё адно як залічаць сёньня да шэрагаў ПКБ сотні тысяч былых членаў КПСС і нават удзельнікаў колішняй КПЗБ.

Кан'юнктура

Расійская праваслаўная царква, на маю думку, пашкодзілі некалькі справаў у яе гісторыі. Па-першае, спроба экспансіі ўглыб Еўропы. Беларуская ўніяцкая царква была скасавана і абвешчана праваслаўнай. Ніхто так не ўчыняў на чужой тэрыторыі. Немцы, напрыклад, не перараблялі мясцовыя храмы на кірхі. Мангола-татары не пераварвалі цэрквы ў свае малельні.

Царква ў СССР была зьняважана і прыручана. Яна не была апазіцыйнай як касцёл у ПНР. Сёньня ў Расіі і ў Беларусі яна імкнецца, па-сутнасці, абслугоўваць улады, атрымліваючы ад іх падачкі. Раней яны руйнавалі цэрквы, а цяпер даюць грошы на іх адбудову. Бог дапамог... Можа так здаецца сьвятарам. Але мне не дужа верыцца, што гэтая дапамога царкве шчырая. Па-простаму палітычная кан'юнктура зьмянілася. Марна чакаць шчырасці ад людзей, для якіх няма нічога сьвятога апроч ідэалагічных атрыбутаў. Бо сацыялізм, няхай нават "рынкавы", усё адно грунтуецца на атэізме. Вядомы расійскі філосаф В.Разанаў пісаў калісьці пра катастрофу 1917г.: "Пераход у сацыялізм і, значыцца, ў поўны атэізм, адбыўся ў мужыкоў, у салдат да таго лёгка, быццам у лазню схадзілі і абліліся новай вадою... На хрысціянства раптам усе пазабыліся, у адзін момант, — мужыкі, салдаты... Бом. Бом. Бом. Але гук ужо пусты."

Сяргей АСТРАЎЦОЎ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Крыўдуйце на саміх сябе

Сяргей НАВУМЧЫК

Днямі прачытаў інтэрв'ю Аляксандра Абрамовіча, былога старшыні ЦВК і новапрызначанага намесніка кіраўніка адміністрацыі прэзідэнта. У мяне Аляксандр Міхайлавіч заўсёды выклікаў павагу тым, што служыў закону. Амаль заўсёды яго ныя рашэнні мне не падабаліся, не задавальнялі палітычна ці выглядалі несправядлівымі — але я разумеў, што тут прэтэнзіі не да Абрамовіча, а да недасканалага заканадаўства.

І што мы чытаем у гэтым інтэрв'ю. Пра Канстытуцыйны суд — "вопрос следует решать стратегически, с учетом наших особенностей". Пра суадносіны прэзідэнцкіх указаў і законаў — "кто сказал, что с учетом нынешнего развития экономических отношений (сегодняшнего, а не будущего) мы знаем оптимальные пределы регулирования экономических отношений через законы?". Нарэшце — пра абмежаванне свабоды друку, фактычнае закрыццё некаторых газетаў: "То, что газеты выходят, пусть даже и за границей — все-таки элемент свободы".

Ну, што тут скажаш — сапраўды, недзе за мяжой газеты друкуюцца. Спрачацца з гэтым немагчыма. У турме воля вязня абмежаваная дзесяццю квадратнымі метрамі камеры. У лагерах ГУЛАГа можна было перамяшчацца па вялізным бараку. І нават наведвацца ў суседні барак. Больш за тое — пад наглядам — выходзіць на лесасеку кіламетраў за дзесяць, гадзінаў з пятнаццаць памахаць сякераю.. Хіба ў параўнанні з камераю смяротнікаў —не свабода? А вось у 1978 годзе Вішнеўскую ды Растраповіча пазбавілі савецкага грамадзянства, і яны вунь як гастралявалі па ўсім свеце — чым не свабода перамяшчэння?

Як бачым — усё адносна, гледзячы з чым параўноўваць.

Дык з чым жа Вы, Аляксандр Міхайлавіч, параўноўваеце? З якімі часамі —Іосіфа Вісарыёнавіча, Леаніда Ільіча, і з якімі краінамі — з Кубай, з Паўночнай Карэяй?

І гэта гаворыць не Посахаў, не Замяталін, а Абрамовіч, былы член Камітэта Канстытуцыйнага нагляду СССР, доктар навук, прафесар. Той самы Абрамовіч, які ў 1992 годзе кінуў парламенцкай большасці: подпісы за рэферэндум аб датэрміновых выбарах, сабраныя БНФ — сапраўдныя!

Што здарылася з Аляксандрам Міхайлавічам?

А нічога, я перакананы, што яму самому няёмка казаць такія словы. Ён адчувае іх недарэчнасць. Проста цяпер Аляксандр Міхайлавіч — у гэтай сістэме. І мне яго шкада.

Інтэлігенцыя і ўлада — тэма старая. І сумная. Але куды больш сумна, калі інтэлігенцыя апынаецца на службе ва ўлады неадукаванай і ў маральным сэнсе неразборлівай. Тады інтэлігенцыя рызыкуе пераняць самыя горшыя якасці сваіх патронаў. Да таго ж, яна губляе самапавагу, і, значыць, траціць права звацца інтэлігенцыяй.

Вельмі непрыгожа, па-хамску быў адпраўлены ў адстаўку міністр прамысловасці Куранкоў. Але крыўдаваць Куранкову на Лукашэнку не выпадае.

10.15 "Иван Макарович". Х/ф.
11.35 Мультфильм.
11.55 "Его батальон". Х/ф.
15.00 Новости.
15.15 "Солдатенок". Х/ф.
15.55 "Споемте, друзья!" Концерт для ветеранов.
16.40 "Так это было..."
17.00 "Споемте, друзья!" Ч. 2.
17.50 Музыкальный антракт.
18.00 На пути к Уимблдону. Командный чемпионат Европы по теннису среди юношей.
18.25 Экономикст.
18.35 MTV.
18.50 Новости
19.05 "Международный курьер".
19.40 "Вестгейт".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 Музыкальный антракт.
22.10 "Жаворонок". Х/ф.
23.40 Телевизионный Дом кино.
0.10 Новости.
0.25 Акколада.

ОРТ
5.00 Телеутро.
8.00 Новости.
8.15 "Секрет тропиканки".
9.05 "Один на один".
9.45 "Моя Россия".
10.25 "Пока все дома".
11.00 Новости.
11.10 "От пятницы до пятницы".
11.50 "ТАСС уполномочен заявить..."
13.00 Мультфильм.
13.10 "Т.С.Н"
14.00 Новости.
14.20 "Драконы подземелий".
14.40 "Дети Чечни".
15.05 Фильм-сказка. "Как Иванушка-дурачок за чудом ходил".
16.30 "Семь дней спорта".
17.00 Новости.
17.20 "Секрет тропиканки".
18.10 "Служу России!".
18.25 Человек и закон.
18.55 "Поле чудес".
19.45 "Спокойной ночи, малыши!".
20.00 Время.
20.45 "Щит и меч".
22.05 Взгляд.
22.50 Новости.
23.00 "Одиночное плавание". Х/ф
0.35 "Семь дней спорта".
1.05 "Цыганский барон".

Канал "Россия"
6.30 Время деловых людей.
7.00,10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.25 Требуются...
7.30 "Что день грядущий..."
7.35 Ритмика.
7.50 Всего понемногу.
8.40 Телегазета.
8.45 Крестьянский вопрос.
9.05 "Санта-Барбара". Х/ф.
10.20 Милицейская хроника.
10.30 Торговый дом.
10.45 "Душа моя, масленица".
11.15 Музыкальный экспромт.
15.05 Там-там новости.
15.20 Продленка.
15.50 Месяцеслов.
16.20 Новая линия. "Отечества ради".
16.50 Дисней по пятницам.
17.50 Клип-антракт.
17.55 Белая ворона.
18.25 Правительственные будни.
19.25 Подробности.
19.35 "Санта-Барбара". Х/ф.
20.30 Анализы недели.
21.10 "Колизей".
22.30 Река времени.
22.35 Автомиг.
22.40 "Привет с фронта". Х/ф.
24.00 "Оставайтесь в шляпе".

IV канал, НТВ
7.30 Мир вашему дому.
7.40,10.30,13.30,16.45 СИВ.
7.50 Английский язык для детей.
8.10 "Архангельские новеллы". Мультфильм.
8.25 Как устроен мир. "Два рассказа о памяти".
8.45 П.И.Чайковский. "Пиковая дама".
9.30 Английский язык.
10.00 Начинаем деловой английский.
10.35 АНК
12.30 Час "Реалиста".
13.30 СИВ. Новости.
13.35 "Белая цапля". Мультфильм.
13.55 Русская речь.
14.25 Видеопоэзия.
14.30 "Актриса". Х/ф.
15.45 Ваш адвокат.
16.00 Музыкальные музеи мира.
16.30 Коктейль для любопытных.
17.00 "Чудесные годы".
17.30 Футбольный клуб.
18.00, 21.00, 23.00 "Сегодня".
18.35 Герой дня.
19.00 "Прощай, шпана замоскворецкая...". Х/ф.
20.40 Мультфильм
21.35 "Доктор Куин, женщина-врач".
22.30 Времечко.
23.20 "История ужасов". Х/ф.
0.50 Эротическое шоу мира.

Санкт-Петербург
12.00,15.30, 18.30, 21.45 Информ ТВ.
12.10 "Гром в раю". Х/ф.
12.55 Музыкальный момент.
13.00 Скорая помощь.
13.30 Советы садоводам.
13.40 "Команда 33". Х/ф.
15.05 Мультфильм.
15.15 Стиль жизни.
15.40 "Немецкая волна".
16.00 Детское ТВ
16.40 Во славу Отечества.
17.10 ЛОТ
18.10 Большой фестиваль.
18.50 Спортивные новости.
18.55 "Гром в раю". Х/ф.
19.40 Телеслужба безопасности.
19.50 К Дню Российской армии.
20.20 "Команда 33". Х/ф.
22.00 Спорт, спорт, спорт...
22.10 День рождения.
22.20 "Парад парадов".
23.00 "Избранник". Х/ф (Грузия).

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

24 лютага

Белорусское телевидение
8.00 Новости.
8.15 Уроки Н.Новожиловой.
8.45 Созвучие.
9.05 Сущность.
9.35 Здоровье.
10.05 Все про все.
10.30 "Ералаш".
10.50 Лучшие хиты MTV.
11.30 "Моя любовь, моя печаль".
12.30 Гурман.
12.50 Мир природы и увлечений.
13.30 Сюрпризы Рупольдинга.
13.50 Многоголосие.
14.20 Белорусский дом.
15.00 Коллаж.
15.30 "Поздравляем вас!"
16.20 Силач.
17.05 Четвертое измерение.
17.50 "Зорная ростань".
18.30 Галерея.
19.00 "Стакан воды". Х/ф. с. 1 серия.
20.05 Банка комиксов.
20.40 Колыбельная.
21.00 Новости.
21.45 Х/ф "Высокий дух".
23.30 Видимо-невидимо.

ОРТ
6.45 Телеканал "Подъем!".
7.45 Слово пастыря.
8.00 Новости.
8.10 Телеканал "Подъем!".
9.30 "Не зевай!".
10.00 Утренняя почта.
10.35 Смак.
10.55 Фильм. "Дом, в котором я живу".
12.40 "Виктория".
13.30 Мультфильм "Крокодил Гена".
14.00 Новости.
14.20 "Автомобиль и я".
14.40 В мире животных.
15.20 "Окно в Европу".
15.50 Бомонд.
16.10 "Счастливый случай".
17.00 Новости.
17.20 "Телескоп".
18.00 "Золотая серия". Год 1971-й. "Офицеры".
19.45 "Спокойной ночи, малыши!".
20.00 Время.
20.45 "Детективное агентство "Лунный свет".
21.40 "Брэйн ринг".
22.30 Новости.
22.40 Фильм "От всего сердца".
0.25 "То мужчина, то женщина". Телефильм

Канал "Россия"
7.00,13.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.25 "Что день грядущий..."
7.30 "Вовкулакия, или Загадка доктора Никодима".
7.45 "Одиссея". Х/ф.
8.05 Этикетка.
8.15 Твои возможности, человек.
8.45 Парламентская неделя.
9.30 Большой хоккей.
10.10 Как жить будем?
10.55,22.30 Служба 299-00-00.
11.10 "Все прочее — литература".
11.40 "Давайте жить по солнечным часам".
12.30 "Поэт в России — больше, чем поэт".
13.20 Де факто.
13.35 "Эмили". Телефильм.
14.30 Караоке по-русски.
14.50 Сигнальный экземпляр.
15.00 Пилигрим.
15.45 Клип-антракт.
15.50 Футбол без границ.
16.35 Империя игр.
17.25 Астрология любви.
17.55 "Петербургские тайны".
19.25 Субботний вечер с Инной Чуриковой.
21.05 Совершенно секретно.
22.45 Река времени.
22.50 Автомиг.
22.55 Программа "А".
23.55 Адамово яблоко.

IV канал, НТВ
7.00 Возвращение к Богу.
7.30 Мультфильмы.
8.00 Анонс Семейного канала.
8.10 Кто на новенького?
8.40 Покупка.
9.00 В гостиной Семейного канала.
9.20 Домовладелец.
9.35 Это все о цветах.
9.50 Приватный разговор.
10.00 На дорогах России.
10.05 Пенсион.
10.10 Медицина для Вас.
10.30 СИВ.
10.35 В гостиной Семейного канала.
11.00 "Время "Ч".
11.30 Непознанная Вселенная.
12.00 В гостиной Семейного канала.
12.20 Экономическое обозрение
"В семейный блокнот".
12.50 Юмориста вызывали?
13.05 В гостиной Семейного канала.
13.30 СИВ.
13.35 "С полуслова".
13.50 Москва пассажирская.
14.00 "С полуслова".
14.15 Научные субботы.
14.45 "Строгановы". Глава 1.
15.15 СИВ. "Дом моды".
15.35 Музыкальная кунсткамера.
16.05 СИВ. "Новости кино".
16.25 "Сокровища пирамиды".
16.45 СИВ.
17.00 "Динозаврик по имени Динк".
17.30 "Дог-шоу. Я и моя собака".
18.00, 21.00 "Сегодня".
18.35 Вернисаж Ильи Резника: Марк Минков.
19.05 "Крутой Уокер: Правосудие по-техасски".
20.00 Намедни.
20.45 Куклы.
21.35 "Джеймс Бонд — Агент 007". Ф. 1.
23.30 Третий глаз.
0.15 "Плейбой".

Санкт-Петербург
8.25 "Актуально-насущно".
9.00 Стиль жизни.
9.15 Музыкальный момент.
9.20 "Рецепт".
9.30 Страсти-мордасти.
9.45 "Жак Риветт". Ч. 2.
10.45 День рождения.
10.50 И все былое...
11.30 Ток-шоу "Наобум".
12.00 "Белое братство" два года спустя". П. 1.
12.30 Мультфильм.
13.30 Телеканал "Еще одна Россия".
15.00 Будни и праздники театра на Литейном.
15.30,18.30, 20.20, 21.00 Информ ТВ.
15.40 Мы и банк.
16.20 Зебра.
17.05 "Не хочешь - не смотри".
17.40 Ничего, кроме...
17.55 Теле-граф.
18.10 Большой фестиваль.
18.50 Спортивная программа.
20.25 "Самостоятельное расследование".
21.20 Х/ф "Кристина".
21.55 Музыкальный рай.
23.25 "Макси". Х/ф.

Белорусское телевидение
8.00 Футбол. Чемпионат Англии. Премьер-лига.
9.35 "Патриарх".
9.55 Телебом.
10.15 "Конон".
10.40 Все нормально, мама!
11.10 Арсенал.
11.40 Туробьектив.
12.00 "Моя любовь, моя печаль".
13.00 Студия "Окно".
13.50 "Все мы родом из детства".
15.05 "Крок".
15.50 Уроки Рупольдинга.
16.05 Авто-парк.
16.20 "Дикий юг".
16.50 Мост.
17.15 Театр в кресле.
17.55 Гости в дом.
18.05 Бездельник.
18.30 "Стакан воды". с. 2.
19.40 Колыбельная.
20.00 Резонанс.
20.50 Новости-ТВ.
21.05 "Карамболь".
21.40 "Государственный принцип". Х/ф.
23.50 "Бархатный сезон".
0.20 Хоккей. Чемпионат ВЕХЛ. "Белсталь"(Жлобин) - "Неман"(Гродно). п. 3.

ОРТ
6.50 Тираж "Спортлото".
7.00 Телеканал "Подъем!".
8.00 Новости.
8.10 Телеканал "Подъем!".
9.25 Пока все дома.
10.00 Утренняя звезда.
10.50 Из первых рук.
11.00 "Военный курьер".
11.30 Песни "Золотого кольца".
12.00 "Севастопольские рассказы. Год 1996-й".
12.30 Под знаком "Пи".
13.00 Смехопанорама.
13.30 Сериал "Пираты".
14.00 Новости.
14.20 Музыка в эфире.
15.10 Клуб путешественников.
15.55 Как-то раз.
16.10 Мультфильмы "Чебурашка". "Шапокляк", "Чебурашка идет в школу".
17.00 Новости.
17.20 "Ералаш".
17.40 Футбольное обозрение.
18.10 Клуб "Белый попугай".
19.00 "Паспорт". Х/ф.
21.00 Воскресенье.
22.00 "Детективное агентство "Лунный свет".
22.55 Новости.
23.05 Любовь с первого взгляда.
23.35 "Все звезды".
0.05 "Марат, Лика и Леонидик". Фильм-спектакль.

Канал "Россия"
7.00,13.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.25 "Что день грядущий..."
7.30 Теремок.
7.45 Гостиница деда Мазая.
8.00 Наш сад.
8.30 В мире авто- и мотоспорта.
9.00 Доброе утро.
9.30 Аты-баты...
10.00 Вести в одиннадцать.
10.15 Русское лото.
10.55 Кинофестиваль "Золотой билет".
12.15 В поисках литературы.
12.45 Горячая десятка.
13.20 Не вырубить...
13.35 "Эмили". Телефильм.
14.30 Книжная лавка.
15.00 В мире животных.
15.55 Лучшие игры НБА.
17.00 Волшебный мир Диснея.
17.55 "Снимается кино..."
18.00 Колесо истории.
19.25 Сделано в Голливуде. Фильм "Блэйз".
21.35 Клип-антракт.
21.40 Телекросс.
22.30 Служба 299-00-00.
22.45 У Ксюши.
23.15 Река времени.
23.20 Автомиг.

IV канал, НТВ
7.00 Прикосновение.
8.00 Анонс Семейного канала.
8.05 Семь Я.
8.20 Ноу-хау: информация, люди, идеи.
8.50 АБВГДейка.
9.10 В гостиной Семейного канала.
9.30 "Домовой".
9.50 Бонтон.
10.10 Полезные советы.
10.30 СИВ.
10.35 В гостиной Семейного канала.
11.00 В двенадцать пополудни.
12.25 Налоги и доходы.
12.40 Пенсион.
12.45 Компьютерная энциклопедия.
13.00 Графоман.
13.10 Журнал журналов.
13.20 Вас приглашает фирма "Савва".
13.30 СИВ.
13.35 "С полуслова". Финал.
13.50 Шаг из круга.
14.20 "Человек из ресторана". Х\ф.
15.50 Подъем переворотом.
16.20 В гостиной Семейного канала.
16.45 СИВ.
17.00 "Полицейский Кэтс И его собака".
17.30 "Сто к одному".
18.00 "Сегодня".
18.30 "Овация".
19.00 "Крутой Уокер: Правосудие по-техасски".
20.00 Итоги.
21.10 "Пришельцы". Х\ф
22.50 "Поколение".
23.55 НТВ представляет: анонс недели.

Санкт-Петербург
8.00 Это ваш день.
8.25 Целительное слово.
9.00 Стиль жизни.
9.15 "Макси". Х/ф.
10.50 День рождения.
10.55 Храм.
11.25 Слово — депутатам.
12.00 "Белое братство" два года спустя". П. 2.
12.30 "Шоколадный бунт". Х/ф.
13.45 Классика-5.
14.40 Детское ТВ.
15.40 Посмотрим.
15.55 Чемпионат Италии по футболу.
18.00 Пой с нами.
18.30 Информ ТВ.
18.50 "А спать с чужой женой хорошо?". Х\ф
20.15 "Тайна останков царской семьи".
20.35 Телешансон.
21.00 Международное обозрение.
21.25 "Ноу смокинг".
22.10 "Слово полицейского". Х/ф.

ЗАПРАШАЕМ
на працу рэкламных агентаў

Базавы кошт рэкламнай плошчы:
1см² – $ 1,5
Кошт аднаго радка прыватнай аб'явы:
12.000 руб.

СМ²

Скідка рэкламным агенцтвам 25%

Прыватныя аб'явы і віншаванні прымаюцца ў рэдакцыі з **10.00** да **17.00**

АФІША

Культурнае жыццё бліжэйшых дзён неабвержна сведчыць, што эгаізм дарослых адыходзіць у нябыт. І ўсё больш імпрэзаў ды забавак прапануецца дзецям і падлеткам. І гэта слушна, бо, як казаў паэт, "і прыйдзе новых пакаленняў на наша месца грамада".

Дзецям

У мінскім **кінатэатры "Масква"** кожную нядзелю на працягу лютага а 12 гадзіне ладзяцца дзіцячыя дыскатэкі "Лімпапо". Усяго за 15 тысячаў рублёў сапраўдныя артысты з Афрыкі навучаць вашае дзіця танчыць рэгі, хіп-хоп, тэхна, дыска і рэп. А без гэтых танцаў, кажуць, у цяперашнім свеце не пражывеш. Такім чынам, у гэтую нядзелю можна пачаць танчыць.

Аматары мульцікаў змогуць 16 лютага а 12-й гадзіне ў **кінатэатры "Піянер"** спаткацца з жывымі мультыплікатарамі — У.Пяткевічам, А.Ленкіным ды М.Гумеляй. Майстры распавядуць, як яны малююць мульцікі, а потым гледачы пабачаць зборнік, які будзе складацца цалкам з новых мультфільмаў.

Тэатр лялек 17 лютага прапануе ў 10:30 і 12:30 п'есу ў 2-х дзеях Я.Чапавецкага "Мышаня Мыцык". У маленькім, але вельмі жывым спектаклі бяруць удзел мышаня Мыцык, Гаспадыня і кот Кыцык. 18 лютага можна пабачыць спектакль паводле Віталя Вольскага "Дзед і жораў" (гэта беларускі варыянт "Казкі пра рыбака і залатую рыбку"), 20 лютага пройдзе вясёлая казка Артура Вольскага аб хітрамудрым каце і прасцецкім гаспадары "Граф Глінскі-Папялінскі", а 21 лютага — казка паводле Н.Слепаковай "Кот у ботах". Ну проста нейкі кашэчы сезон у тэатры лялек.

У **тэатры юнага гледача** 16 лютага аб 11-й гадзіне і 17 лютага а 12-й ідзе "Чарадзейная гісторыя пра цара джынаў, удачлівага Аладзіна і царэўну Будур". Казка такая ж доўгая і прыгожая, як і яе назва. 18 лютага а 12-й гадзіне і 20 лютага аб 11-й гадзіне тэатр прэзентуе казку паводле Джані Радары "Чароўнае падарожжа ў ноч". 21 лютага аб 11-й ды аб 19-й гадзінах можна паглядзець казку паводле Уільяма Гібсана "Стваральніца цуда". Гэта моцная рэч з даволі сур'ёзным сюжэтам. Яна прымушае гледача задумвацца над тымі псіхалагічнымі сітуацыямі, што ўзнікаюць кожны дзень. Дзеці навучаюцца лепш разумець ірацыянальны свет дарослых.

Імпрэзы, канцэрты, вечарыны

У гэтай рубрыцы я традыцыйна змешваю імпрэзы на любы густ. Выбірайце!

17 і 18 лютага а 19-й ў **ДК Прафсаюзаў** пройдзе маладзёжнае шоў з песнямі і танцамі паводле беларускага фальклору "Рок-н-рол на саломе". Гэтую імпрэзу вызначае таленавітае спалучэнне выбітных рэчаў вясковага і гарадскога фальклору. Музычнае афармленне шоў стварылі музыкі фольк-гурта "Палац". У шоў бяруць удзел акцёры лепшых мінскіх тэатраў, і лепшыя акцёры — Таццяна Жахоўская, Ігар Сідарэнка, Валерый Мацкявічус, Наталля Мотлах, Анатоль Кот. Ладзіць сцэн-шоў тэатр Генадзя Давыдзькі "Бульвар смеху". 17 лютага ў тым жа ДК прафсаюзаў а 15 гадзіне выступяць маскоўскія барды А.Івашчанка ды Г.Васільеў. Кошт квіткоў — ад 15 да 20 тысяч рублёў.

У **кінатэатры "Змена"** а 12 гадзіне адбудзецца сустрэча з Міхасём Жданоўскім, аўтарам дакументальных фільмаў "Арганы Беларусі" і "Успамін пра Міколу Равенскага". Нагадаю, што менавіта Мікола Равенскі — аўтар музыкі да беларускага нацыянальнага гімну "Магутны Божа". Кампазітар усё жыццё быў на Радзіме пакутнікам і памёр недзе на эміграцыі. Пра яго жыццё распавядае дачка Міколы Равенскага, спадарыня Вольга Аляксейчанка-Равенская.

22 лютага ў **Доме літаратара** ў 18:30 пройдзе аўтарская вечарына Ніла Гілевіча пад назваю "Мой белы сон". Ніл Гілевіч прачытае вершы з усіх сваіх зборнікаў, адкажа на пытанні. А іх павінна быць шмат, бо Гілевіч — адна з самых супярэчлівых фігураў у беларускім адраджэнні, палітыцы і культуры.

18 лютага ў **Доме афіцэраў** пройдзе выбітная імпрэза — Саюз акцёраў Таганкі прывозіць у Мінск прэм'еру паводле Чэхава "Мы попали в западню". У спектаклі з такою па-чэхаўску добрай і гарэзлівай назвай бяруць удзел акцёры з Таганкі: Ніна Арцыбашава, Людміла Давыдава, Расмі Джабраілаў, Валерый Пагарэльцаў ды іншыя. Мастацкі кіраўнік тэатру — Мікалай Губенка, добры акцёр, добры бард і некалі — добры міністр культуры Расіі. Кошт квіткоў — ад 40 да 60 тыс.руб. Але сцвярджаю — траты вартыя.

У **фестывальным цэнтры "Акварыўм"** (вул.Кульман, 14) абяцаюць прадстаўленне першага ў Мінску эратычнага тэатру "Стыль аргазм". Тэатр Алеся Эроціча запрашае ў 19:30 на сваё шоў. Не забудзьцеся 55 тысячаў на квіток і яшчэ трохі — на келіх віна для вашай дамы. 22 лютага ў тым жа "Акварыўме" — канцэрт "Спявай, мая гітара?". Будзе бардаўскае свята з удзелам А.Ляднёва і А.Длускага, што набыў вядомасць як шансанье тэатру "Хрыстафор".

Прэзентацыі

У пятніцу 16 лютага а 18.00 у **Літаратурным музеі М.Багдановіча** (вул. М.Багдановіча, 7а) адбудзецца прэзентацыя новай кніжнай серыі "Сучасная літаратура". Гэта сумесны праект выдавецтваў "Наша Ніва" і "Літаратура". На вечарыне будзе прадстаўленая першая кніга серыі — зборнік інтымнай прозы Адама Глёбуса "Толькі не гавары маёй маме", які толькі што надрукаваны ў Варшаве. Адбудзецца сустрэча з аўтарамі гэтай і наступных кніг, а таксама з рэдактарамі і арганізатарамі новага літаратурнага праекту, выступяць пісьменнікі, артысты, музыкі.

Класіка

16 лютага ў **зале камернай музыкі Белдзярж-філармоніі** адбудзецца канцэрт вакальнай і арганнай музыкі. Наталля Бярэзіна (сапрана), Ігар Алоўнікаў (арган), Ірына Баркун (фартэпіяна) ды Аляксей Афанасьеў (віяланчэль) выканаюць творы Баха, Гендэля, Моцарта, Пергалэзі, Пучыні, Фарэ.

17 лютага прагучаць творы кампазітараў-імпрэсіяністаў. Музыка Дэбюсі, як слушна заўважыў нехта, нагадвае пацалунак у снег. Акрамя Дэбюсі будуць выкананыя свежыя і пяшчотныя творы Вівальдзі, Баха, Нойбаўэра, Равэля.

20 лютага ансамбль флейтыстаў "Сірынкс" выканае Баха, Дэбюсі, Доплера, Каральчука. "Сірынкс" — па-старажытнагрэцку чарот, менавіта так звалі німфу, якая пераўтварылася ў чароціну, з якое зрабілі музычны інструмент — правобраз усіх дудачак, флейт і жалейкаў свету.

22 лютага — вечар баяннай музыкі, які здольны пераканаць любога скептыка ў тым, што на баяне можна і трэба іграць не толькі прыпеўкі. Прагучаць творы Баха, Ліста, Гендэля, Гранадэса, Расіні, Штраўса, Чайкоўскага, Залатарова і Холмінава. Грае лаўрэат міжнароднага конкурсу Ігар Карнажыцкі.

Тэатры

Тэатр музкамедыі прапануе наступныя спектаклі: 16 лютага — "Прынцэса цырку" Імрэ Кальмана, 17 лютага — балет Л.Мінкуса "Дон Кіхот", 18 лютага вечарам — І.Штраўс, "Лятучая мыш"("Жанчына-кажан"), 21 лютага — І.Кальман, "Марыца", 22 лютага — мюзікл "Шклянка вады" на музыку беларускага кампазітара У.Кандрусевіча.

Тэатр оперы і балету 16 лютага прэзентуе слынны "Спартак" А.Хачатурана. Гэта расповед пра легендарнае жыццё і каханне караля рабоў, але свабоднага чалавека Спартака. Спектакль ладзіцца на 75-годдзе народнага артыста СССР, дырыжора Яраслава Вашчака. Лібрэта ў рэдакцыі В.Елізар'ева ды Я.Лысіка. Спартак — заслужаны артыст Беларусі Веніямін Захараў, Фрыгія — народная артыстка Беларусі Інэса Душкевіч, Крас — Руслан Мінін.

16 лютага вас чакае опера Дж.Пучыні "Чыо-чыо-сан", а 18 лютага — балет Х.Левенскольда "Сільфіда" — рамантычная мроя аб лясных духах. 18 лютага прагучыць опера "Кармэн" паводле Ж.Бізэ і навэлы П.Мэрымэ. Лібрэта А.Мельяка і Л.Галеві. Гісторыю страсці і гісторыю смерці вы пабачыце на сцэне, як тысячы разоў бачылі ў жыцці, і ўсё роўна не разгадаеце іх загадак... Партыю Кармэн выканае З.Варапай, Хазэ — Э.Пелагейчанка.

Тэатр-студыя кінаакцёра 21-22 лютага дае "Фантазіі па Гогалю". У асноўным, гэта мроі па "Рэвізору", які ў нашыя дні глядзіцца як ніколі сучасна. У спектаклі занятыя амаль усе акцёры тэатру, якія, уласна кажучы, і ствараюць відовішча. Вельмі моцная рэч, у якой кожная асоба дасягае вяршыні самараскрыцця.

Тэатр імя Янкі Купалы прапануе 19 і 20 лютага трагікамічныя сцэны паводле "Тутэйшых" Купалы. Рэжысёр — Мікалай Пінігін, якому ўдалося не толькі "выблытацца" з незвычайна доўгіх купалаўскіх тэкстаў, але і стварыць жудасны сімвал беларусаў як нацыі геніяльных прыстасаванцаў, нацыі яшчарак, што ратуюцца, адкідаючы не хвост, а галаву.

22 лютага ў тэатры прэм'ера — "Азірніся ў гневе" паводле Джона Осбарна. Але пра гэта ўжо — наступным разам.

А пакуль — зычу вам весела сустрэць гэты тыдзень, на якім сыйшліся два вялікія святы — Грамніцы ды Святога Валянціна.

Святлана СОЙКА

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Бывае і беларусу шчасце. Ад брытанцаў

Брытанская медыцына выратавала жыццё 8-гадоваму магілёўскаму хлопчыку Дзянісу Шапашнікаву

Яго выхоўвалі бабка з дзедам, бо маці з бацькам пяць год таму адмовіліся ад сваіх бацькоўскіх правоў. Хлопчык быў на ўсім звычайны, але хвараў на сэрца — уроджаны парок. Беларускія лекары змаглі толькі канстатаваць гэтую хваробу. Бабулі ўдалося адправіць Дзяніса ў Англію на месячны адпачынак. З сабой ён павёз ліст, у якім бабуля прасіла дапамагчы выратаваць жыццё ўнуку.

Далей пачалося тое, пра што мы часцей можам толькі марыць. Калі гаспадары, да якіх патрапіў Дзяніс, паказалі яго лекарам і даведаліся ад іх, што жыць хлопчыку засталося не больш за шэсць месяцаў, яны адразу ж разварнулі кампанію па зборы сродкаў на аперацыю.

У рамках гэтай кампаніі брытанскія газеты надрукавалі зварот да грамадскасці, мэр горада Прэстан выдаткаваў для лячэння Дзяніса 2.000 фунтаў стэрлінгаў, вядомы кінарэжысёр, лаўрэат "Оскара" Нік Парк правёў дабрачынны паказ свайго фільма "Чыста паголены", славуты кампазітар Гас наладзіў дабрачынныя канцэрты, а адна фірма нават выпусціла паштоўкі з Дзянісавым гараскопам. Натуральна, што ўсе выручаныя грошы ішлі ў фонд лячэння магілёўскага хлопчыка. За два тыдні(!) Англія сабрала неабходныя 9.000 фунтаў стэрлінгаў і неўзабаве Дзянісу зрабілі паспяховую аперацыю.

Сёння яму ўжо нішто не пагражае. Але англічане не забыліся пра свайго маленькага сябра і потым. Служачыя фірмы "Брытанскі космас" ужо падрыхтавалі для 8-гадовага магілёўца падарункі — веласіпед, шлем і наколенікі. У красавіку хлопчык зможа апрабаваць брытанскі ровар.

Па праўдзе, нягледзячы на меладраматычны вынік гэтай, на самой справе шчаслівай, гісторыі, становіцца жахліва, калі ўявіць, што Дзянісу не пашанцавала б апынуцца ў Вялікабрытаніі, а грошы на ягонае лячэнне пачалі б збіраць у нас...

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Барысаў памятае пра баі за Афганістан

На Барысаўскім танкарамонтным заводзе зрабілі два помнікі для горада.

Танк ІС (Іосіф Сталін)-2 установяць на ўездзе ў Барысаў, а БМП-2 у цэнтральнай частцы горада. БМП-2 павінен нагадваць гараджанам пра барацьбу "афганцаў" за свабоду Афганістана.

А.Д.

СПОРТ

Допінгавыя заплывы

Горныя лыжы

За два тыдні мацнейшыя гарнальжнікі разыгралі у Сьера-Невадзе (Іспанія) 10 камплектаў узнагарод сусветнага чэмпіяната. Дарэчы, частка з іх ужо разыграная. У слаламе-супергігансе у жанчын перамога прыйшла да бронзавага прызёра Алімпіяды у Ліліхамеры Ізольды Костнер з Італіі. 66 сотых секунды ёй прайграла Хайдзі Цурбрыген (Швейцарыя), 71 — амерыканка Пікабо Стрыт. У мужчын увесь п'едэстал занялі скандынаўцы. Перамога Атле Скаардале (Нарвегія) выглядала заканамернай, бо ён —адзін з лепшых у гэтай дысцыпліне. Ягоны знакаміты суайчыннік К'еціль-Андрэ Амодт пасля шэрагу няўдач падняўся на трэцюю прыступку. А срэбны медаль зусім нечакана завяваў швед Патрык Арбе.

Тэніс

28-гадовы аўстрыец Томас Мустэр стаў 13-м/с 1973 года тэнісістам, які ўзначаліў рэйтынг лепшых майстраў ракеткі. Менавіта тады ўпершыню быў уведзены кампутарны падлік вынікаў. 23 гады таму першым быў трохразовы пераможца Уімблдонскіх турніраў, тады яшчэ 30-гадовы аўстрыец Джон Ньюкомб. У розныя гады сусветны рэйтынг адкрывалі імёны амерыканцаў Стэна Сміта, Джымі Конарса, Джона Макінроя, Піта Сампраса, Андрэ Агасі, шведаў Б'ерна Борга, Матса Віландэра і Стэфана Эдберга, чэха Івана Лендла, немца Барыса Бекера і іншых бліскучых майстраў. Сам Мустэр выйграў за сваю кар'еру тэнісіста-прафесіянала 35 турніраў, прычым трэць з іх у 1995 годзе. Вядома таксама, што Томас — ляўша, што ён выдатна гуляе на земляных, т. зв. павольных, кортах і значна горш — на кортах з "хуткім" пакрыццём. Новы сусветны лідэр перамог на днях у Ёганесбургу (ПАР) гаспадароў травянога газону Уэйна Ферэйру і Маркуса Андруску у рамках матча Кубка Дэвіса. Але нават таленту Мустэра аказалася замала, паўднёваафрыканцы былі больш удачлівымі — 3:2 і цяпер сустрэнуцца ў чвэрцьфінале з камандай Італіі ў гасцях. Іншыя чвэрцьфінальныя пары: Чэхія — ЗША, Індыя — Швецыя, Францыя — Германія.

Шахматы

Жужа Полгар з Венгрыі упэўнена лідзіруе у матчы за сусветную шахматную карону супраць цяперашняй чэмпіёнкі Се Цзюн з Кітая. Пасля дзевяці партый яна вядзе 6:3. Прызавы фонд гэтага паядынка — 250 тысяч долараў.

Чэмпіён свету Гары Каспараў на працягу амаль шасці гадзінаў змагаўся з кампутарам *Deep blue* фірмы *IBM* і яму ўдалося зраўняць лік — 1:1. У трэцяй партыі — нічыя. Раўнавага захоўваецца. Наперадзе яшчэ тры партыі. Тут удзельнікаў чакае прыз у паўмільёна долараў, з якіх пераможца атрымае 400 тысяч, а пераможаны — 100.

Хакей

Хакеісты мінскага клуба "Цівалі", якія выступаюць у чэмпіянаце МХЛ, стварылі маленькую сенсацыю. У Чалябінску яны згулялі ўнічыю — 1:1 з мясцовым "Трактарам" пасля 13 паразаў запар. Следам за гэтым, аднак, мінчане прайгралі яшчэ два матчы на сваёй пляцоўцы — 0:2 — "Крылам Саветаў" з Масквы і 2:5 — "Нафтахіміку" з Ніжнекамска.

Іншыя беларускія каманды змагаюцца ва Усходне-Еўрапейскай хакейнай лізе. У чарговых матчах "Палімер" (Навапалацк) і "Нёман" (Гродна) абмяняліся ўдарамі — 3:4 і 3:1, а Рызе мясцовы "Юніёрс" узяў тры ачкі з чатырох у жлобінскай "Белсталі" — 6:2 і 4:4. пасля паловы дыстанцыі спераду "Юніёрс" і "Нёман" — па 8 ачкоў, у "Палімера" — 6, "Белсталі" — 2.

Лёгкая атлетыка

Серыю вышэйшых сусветных дасягненняў выдалі лёгкаатлеты. Данаван Бэйлі (Канада) прабег 50 м за 5,56 сек. і палепшыў самае старое дасягненне для залаў на пяць сотых. Ранейшае належала Манфрэду Коколу з ГДР і прастаяла 23 гады. Фрэнкі Фрэдэрыкс з Намібіі прабег у зале стометроўку за 10,05 сек. Нагадаем, што сусветны рэкорд на адкрытых стадыёнах — 9,85. Марыя Мутола (Мазамбік) паказала ў бегу на 1.000 метраў — 2.32,08.

Усе тры атлеты ў розныя гады валодалі тытулам чэмпіёнаў свету.

Валейбол

Нечакана паспяхова правялі матч Кубка ўладальнікаў кубкаў еўрапейскіх краінаў супраць лідэра сваёй групы румынскага "Ардафа" валейбалісты гродзенскага "Камунальніка". Перамога з лікам 3:2 дазволіла гродзенцам набраць 7 ачкоў і выйсці на шостае месца (усяго 8 каманд). А лідзіруе з 9 ачкамі "Ардоф". Спартсменаў яшчэ чакаюць гульні 9 тураў.

Баскетбол

Матч усіх зорак *NBA* "Усход"—"Захад" выйгралі "ўсходнікі", у складзе якіх зіхацелі вялікі Майкл Джордан, прызнаны лепшым іграком матча (20 ачкоў), і Шакіл О'Нiл (25 ачкоў). У "заходнікаў" на гэты раз не былі такімі заўважнымі як звычайна Чарльз Барклі (8 ачкоў) і Хакім Аладж'ювон (4). Лік матча — 129:118.

Баскетбалісткі мінскага "Гарызонта" толькі раз у трох паядынках перадапошняга тура Балтыйскай лігі аказаліся мацнейшымі за суперніцаў. Поспеху яны дамагліся ў гульні з "Тэлекомам" (Вільня) — 86:80, ковенскім "Лайсве" і "Вікторыя" саступілі — 80:90 і 78:84. Перад апошнім турам сітуацыя выглядае так: "Лайсве" — 8 перамогаў у 9 матчах, "Тэлеком" — 5, "Вікторыя" — 3, "Гарызонт" — 2.

Ужо 18 матчаў запар без паразаў правялі у нацыянальным чэмпіянаце баскетбалісты "Гродна-93", на наступных месцах мінскія "Аўтазаводзец" —13 ачкоў, РТІ-РШВСМ — 12 і "Сож" (Гомель) — 11.

Хроніка

Чэмпіёнку і рэкардсменку свету ў плаванні брасам у 25-метровых басейнах Саманту Рылей (Аўстралія) абвінавацілі ў выкарыстанні допінгу якраз падчас тых трыумфальнага для яе чэмпіяната ў Рыа-дэ-Жанэйра ў снежні мінулага года. Рэкорды будуць ануляваныя, а спартсменку чакае двухгадовая дыскваліфікацыя.

Сямён ПЛОЦ

РЫНКАВЫ САЦЫЯЛІЗМ

Начны спіртавоз Гродна – Беласток

Тысячы кантрабандыстаў-карабейнікаў цалкам легальна перасякаюць беларуска-польскую мяжу. Абмяжоўваюцца цыгарэтамі і спіртам. Праўда, не такі гэта цяпер аплатны бізнэс. Зарабіць на кожнай бутэльцы ўдаецца самае большае тры даляры. Але ўсё адно, жыць нейк трэба. Заводы спыніліся, працы няма. Таму сёння, вось такой кантрабандай і проста "прыгранічным" гандлем зарабляе немалая колькасць жыхароў Гродна і яго ваколіц.

"Болек і Лёлек"

Начны цягнік "Гродна—Беласток" пастаянныя пасажыры паміж сабой называюць іранічна "Болекам і Лёлекам" (паводле вядомага польскага мультсерыяла). Пасажыры пачынаюць збірацца на Гродзенскім чыгуначным вакзале за 7-8 гадзін да адпраўлення цягніка — г.зн. тады, калі ён яшчэ не выехаў з Беластоку. Папярэдняй падрыхтоўцы надаецца вельмі вялікая ўвага. Калі вы едзеце з іншай мэтай і не вязеце "стратэгічнага тавару", тады да вас будуць увесь час прыставаць з просьбамі дапамагчы правезці частку цыгарэт і спірту праз мяжу. Просяць далікатна і з усмешкай. Бо, па-першае, сітуацыя вельмі сур'ёзная. А па-другое, на заходняй мяжы адчуваецца, відаць, "тлетворны" уплыў Захаду, дзе людзі традыцыйна ўсміхаюцца значна часцей за нас.

З вялікімі валізамі сёння едуць за мяжу хіба што сапраўдныя турысты, якіх мытнікі вызначаюць беспамылкова. Звычайныя ж гандляры і тыя, хто вязе кантрабандны тавар ездзяць улегцы, з невялікімі кайстрамі. Прыблізна толькі палова з іх купляе ў касе білеты. Астатнія збіраюцца трапіць у Польшчу "зайцам". Білет да памежнай польскай станцыі Кузніца каштуе 3 долары, а да Беластоку — 4. Кантрабандысты імкнуцца і на гэтым эканоміць, бо інакш іхная справа амаль не мае сэнсу. Згадзіцеся: смешна было б займацца гэткім небяспечным гандлем дзеля таго, каб зарабіць на пляшцы ўсяго 10-11 тысяч рублёў — кошт дзвюх сасіскаў у буфеце. Вельмі важна трапіць на мытню без білета на цягнік. Пры ўваходзе чакае кантралёр, і можна толькі здагадвацца, як "зайцам" гэта ўдаецца ажыццявіць.

Адстойнік

Нашы мытнікі даўно паспакайнелі і без колішняй апантанасці корпаюцца ў торбах, а часам і ўвогуле не цікавяцца, што ў вас там. Большасць пасажыраў ім вядомая з твараў, бо тыя на мытні адчуваюць сябе як дома, паколькі ездзяць у Польшчу пастаянна.

Пасля мытні ўсіх запускаюць чакаць цягнік у адстойнік. Тут усяго некалькі лавак, таму большасць пасажыраў даводзіцца або стаяць, або размяшчацца на халоднай бетоннай падлозе. Тут праўда, ёсць шапік з напоямі, у тым ліку і моцнымі. Але пакуль пасажырам не да піва. Ім трэба выканаць яшчэ адну вельмі важную справу. Рэч у тым, што нашая мытня дазваляе правозіць пяць пляшак спірту і пяць блокаў цыгарэт, а палякі — удвая менш. "Лішні" тавар перад польскай мытняй неабходна дзесьці схаваць. Спірт, напрыклад, пераліваецца ў пустыя пластыкавыя бутэлькі з-пад напояў, якія папярэдне сплюшчылі над агнём. Хоць тара і не надта прыгожая, але затое зручная. Хаваюць іх пад спаднічы, у адмыслова прышытыя кішэні, пад пахамі і ў іншых нябачных для вока месцах. Гэта працягваецца каля гадзіны. Засоўваюць бутэлькі са спіртам і ў чорныя панчохі (менавіта ў чорныя, каб польскі мытнік, нават з ліхтарыкам, не мог іх заўважыць).

Кантроль

Яшчэ на пад'ездзе да польскай мяжы пачынаецца праверка білетаў, і тым, каму пашанцавала на вакзале праслізнуць "зайцам", не варта асабліва хвалявацца. Кожны ведае, што дастаткова будзе даць кантралёру два злотыя.

У Кузніцы ў цягніку робіцца ціха. Тут чакаюць галоўнай падзеі — прыходу польскіх мытнікаў. Спачатку ў вагон заходзяць салдаты з адвёрткамі. Яны разбіраюць сядзенні, унутраную абшыўку вагона, паўсюдна свецяць ліхтарыкамі, корпаюцца ў прыбіральнях, у тамбурах, раскручваюць літаральна ўсе вінцікі. У палякаў таксама своеасаблівы план — трэба напоўніць кантрабандным таварам вялікую торбу, з якой яны абыходзяць вагон. Часам ім даводзіцца бачыць пры гэтым слёзы і чуць скаргі."Ой, пан, бяда, дзіця памерла, грошай няма, працы няма, пашкадуй..." На што пан на чыстай рускай мове адказвае, што праўярае няшчасную кабету "сёння ўжо другі раз", і таму не "больш у Польшчу не пусціць".

Побач з вакзалам у Беластоку невялікі рынак, які віруе з трох гадзінаў раніцы. Тут можна збыць свой спірт і цыгарэты, калі толькі на іх не знайшлося раней пакупнікоў, якія заходзяць у цягнік яшчэ ў Кузніцы.

Каля 12 гадзінаў раніцы ў цягніку Варшава — Гродна у Беластоку ўсе месцы ўжо занятыя, няма дзе яблыку ўпасці. Людзі стаяць гэтак шчыльна, што кантралёрам пры ўсім іхнім жаданні не прабрацца ў сярэдзіну. А білетаў, дарэчы, зноў амаль ніхто не купляў. У тамбурах крычаць, каб перадавалі грошы на праезд. Але крычаць можна колькі хочаш. Зноў жа аплаціць давядзецца толькі тым, хто апынуўся побач з кантралёрам.

Нашы мытнікі таксама асаблівай цікавасці да "турыстаў" з пустымі кайстрамі, якія толькі што вярнуліся з-за мяжы, не выяўляюць.

На Гродзенскім чыгуначным вакзале частка з іх бярэ новую партыю спірту і вяртаецца назад у Польшчу. Кажуць, што некаторыя з іх спраўляюцца тройчы за суткі перасячы мяжу туды і назад.

Міхал МІКАЛАЙЧЫК

ПРАПАНУЕМ АПЕРАТЫЎНАЕ І ЯКАСНАЕ ПАМНАЖЭННЕ бланкаў, рэкламных абвестак і інш. РЫЗАГРАФІЯ. Тэл. 23-84-89

КВАЛИФИЦИРОВАННЫЙ СТОЛЯР, имеющий деревообрабатывающий станок, выполнит серьезные заказы. Тел.59-68-15 (после 17.00)

Вы любіце СВАБОДУ, маеце вольны час і хочаце зарабіць?

Наша газета можа заключыць з вамі дамову на распаўсюджванне СВАБОДЫ

ТЭЛЕФАНУЙЦЕ:
- Мінск 36.24.41
- Брэст 26.47.13
- Гродна 45.41.83
- Магілёў 22.63.19
- Орша 4.28.57

Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by © СВАБОДА Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад 93.000
Нумар падпісаны ў друк 14.01.96 (15.00) Надрукавана ў ЗАТ Lietuvos Rytas (Вільня, праспект Гедыміна,12А)

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010